# НОВЫХ ПРАЦОЎНЫХ ПЕРАМОГ ВАМ, САЛІГОРЦЫ!

**Рабочым, інжынерна-тэхнічным работнікам і служачым, партыйным, прафсаюзным і камсамольскім арганізацыям будаўнічага трэста № 3, мантажных і спецыялізаваных арганізацый Міністэрства будаўніцтва БССР, Беларускага ўпраўлення „Шахтаспецбуд“ і іншых мантажных арганізацый дзяржаўнага вытворчага камітэта па мантажных і спецыяльных будаўнічых работах СССР, калектыву Першага Салігорскага калійнага камбіната**

Дарагія таварышы!

Цэнтральны Камітэт КП Беларусі і Савет Міністраў БССР сардэчна віншуюць будаўнікоў, мантажнікаў і эксплуатацыйнікаў Першага Салігорскага калійнага камбіната з вялікай вытворчай перамогай — датэрміновай здачай у эксплуатацыю магутнасцей па вырабу абагачаных калійных угнаенняў.

Увод у эксплуатацыю першай чаргі Першага Салігорскага камбіната на тры тыдні раней устаноўленага тэрміну — добры падарунак Радзіме ў дні работы снежаньскага Пленума ЦК КПСС.

Дасягнуты поспех з'яўляецца дастойным адказам рабочых, інжынераў і тэхнікаў, усіх будаўнічых і мантажных арганізацый на клопаты Камуністычнай партыі аб далейшым уздыме сельскагаспадарчай вытворчасці і няўхільным павышэнні матэрыяльнага дабрабыту савецкага народа.

Будаўніцтва Салігорскага калійнага камбіната з'явілася вялікай школай арганізацыі паскоранага збудавання прадпрыемстваў вялікай хіміі, высокага майстэрства рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў, шырокага ўжывання індустрыяльных метадаў будаўнічых і мантажных работ. Узоры самаадданай працы па наладцы і асваенні складанага тэхналагічнага абсталявання паказаў калектыў калійнага камбіната.

ЦК КП Беларусі і Савет Міністраў БССР выказваюць упэўненасць, што будаўнікі, мантажнікі і эксплуатацыйнікі Салігорскага калійнага камбіната паспяхова асвояць уведзеныя вытворчыя магутнасці і яшчэ шырэй разгорнуць сацыялістычнае спаборніцтва, забяспечаць датэрміновы пуск у 1964 годзе другой чаргі Першага калійнага камбіната і паскоранае збудаванне аб'ектаў Другога Салігорскага калійнага камбіната.

Новых працоўных перамог вам, дарагія таварышы!

**ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КП БЕЛАРУСІ.**

**САВЕТ МІНІСТРАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР.**